**А.Р. АГЕЕЎ**
г. Магілёў, УА «МДУ імя А.А. Куляшова»

# УДЗЕЛ МАГІЛЁЎСКІХ КАМУНІСТАЎ У ПРАЦЫ XXII – XXVII З'ЕЗДАЎ КПБ

Стэнаграмы галоўных падзей ў жыцці партыі – з'ездаў КПБ пяцідзесятых і шасцідзесятых гадоў – надзвычай цікавыя дакументы. Нягледзячы на перабольшванне ў дакладах і выступленнях магутнасці СССР, услаўленне саміх сябе і свайго «адзіна вернага вучэння», шаблоннасць многіх выступленняў, яны дазваляюць адчуць дух эпохі і яе асноўныя праблемы, убачыць асаблівасці стылю кіравання лідэраў КПБ і многае іншае. Удзел у гэтых партыйных форумах магіляўчан уяўляе пэўны канкрэтна-гістарычны інтарэс.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ХХІІ з'езд КПБ адбыўся 24–27 студзеня 1956 г. На з'ездзе падводзіліся вынікі пятай і планы на шостую пяцігодку. Сярод 57 членаў прэзідыума былі і магіляўчане: таварыш Сікорскі – першы сакратар Магілёўскага абкама партыі і ўжо вядомы на той момант старшыня калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна Кірыла Пракопавіч Арлоўскі [1, л. 35–38].

У дэбатах па дакладу першага сакратара ЦК КПБ таварыша Патолічава ад Магілёўскай абласной партарганізацыі слова ўзяў першы сакратар яе абкама Сікорскі С.І. Яго выступленне было даволі крытычным і прынцыповым. Пасля рытуальных слоў аб тым, што вобласць ідзе насустрач з'езду партыі ў абстаноўцы вялікага палітычнага ўздыму, і падзяк таварышу Патолічаву, які «востра агаліў нашы памылкі, недахопы і ўказаў на меры ліквідацыі гэтых недахопаў», сакратар Магілёўскага абкама партыі пачаў сур'ёзную размову аб праблемах народнай гаспадаркі не толькі вобласці, але і рэспублікі.

Адзначыўшы хуткі рост прамысловасці, выпуск новых машын, Сікорскі ўказаў на «нізкі ўзровень кіраўніцтва, коснасць, руціну і зазнайства» як галоўныя прычыны сур'ёзных недахопаў у прамысловасці і будаўніцтве, якія абкаму прыходзіцца «ламаць», для чаго часцей праводзіць вытворчыя нарады і тэхнічныя канферэнцыі. Крытычна была ацэнена праца не толькі магілёўскіх заводаў № 511, цаглянага № 8 і фабрыкі імя Халтурына, але і Міністэрства мясцовай прамысловасці. Асобна прамоўца прыпыніўся на пытанні «невыносных умоў працы з-за моцнай загазаванасці» на металургічным заводзе, падкрэсліўшы пры гэтым, што абкам партыі неаднаразова ставіў гэтае пытанне, але міністр т. Семяніхін, які, калі быў сакратаром ЦК, сам крытыкаваў за гэта Магілёўскую абласную партарганізацыю, цяпер не рэагуе на нашы прапановы, і трэба прызваць яго да парадку.

У галіне сельскай гаспадаркі ім было адзначана, што вобласць рэзка павялічыла пасевы кукурузы, а ў 1955 г. упершыню за пасляваенныя гады забяспечыла сябе насеннем. Праблемай заставалася нізкая ўраджайнасць, перш-наперш з-за недахопу ўгнаенняў. Колькі мы «лапацілі» пытанне торфу, з сумам адзначыў т. Сікорскі, але «пытанне ж не рашаецца, толькі словы, толькі прамовы па гэтаму пытанню, а спраў ніякіх». Упамянуў ён і нізкую прадукцыйнасць жывёлагадоўлі, за што вобласць крытыкавалі на ўсесаюзнай нарадзе па сельскай гаспадарцы, адставанне ў гэтай галіне Мсціслаўскага, Горацкага, Шклоўскага раёнаў. Паскардзіўся Сікорскі на тое, што спробы абкама шляхам абагульнення станоўчага вопыту, штодзённых справаздач (традыцыйнымі метадамі ўзмоцненага кантролю – аўт.) выправіць сітуацыю сустрэлі ў духу паслясталінскіх рашэнняў крытыку з боку работнікаў ЦК. Падобнымі па структуры былі і далейшыя выступленні на з'ездах сакратароў Магілёўскага абкама партыі [1, л. 168–176].

У 1959–1961 гг. з'езды партыі адбываліся штогод.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Нечарговы XXIII з'езд КПБ праходзіў 14–15 студзеня 1959 г. Быў абраны прэзідыум у складзе 47 чалавек. Сярод іх былі таварышы: Мацюшэўскі К.В. – першы сакратар Магілёўскага абласнога камітэта кампартыі, Жылянін Я.А. – старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта і два старшыні калгасаў з Магілёўшчыны: «Рассвет» – Арлоўскі К.П., «Камінтэрн» Магілёўскага раёна – Сяргееў І.В. На разгляд дэлегатаў выносілася адно пытанне: тэзісы даклада Н.С. Хрушчова на XXI з'ездзе і кантрольныя лічбы развіцця народнай гаспадаркі на сямігодку (1959–65 гг.) [2, л. 4–6].

У дыскусіі пасля даклада першага сакратара ЦК КПБ таварыша Мазурава выступілі 24 камуністы. Ад імя Магілёўскай абласной арганізацыі прамаўляў Мацюшэўскі, які напачатку адзначыў, што «працоўныя Магілёўскай вобласці, як і ўвесь савецкі народ, з найвялікшай радасцю і натхненнем сустрэлі тэзісы даклада таварыша Мікіты Сяргеевіча Хрушчова на XXI з'ездзе КПСС», у абмеркаванні якіх прынялі ўдзел 284 тысячы жыхароў Магілёўшчыны. Сакратар Магілёўскага абкама падкрэсліў, што на мітынгах і сходах працоўныя вобласці закляймілі ганьбай «антыпартыйную групу Маленкова, Кагановіча, Молатава...», што ў вобласці больш 200 брыгад, якія змагаюцца за званне брыгад камуністычнай працы, што вобласць датэрмінова 21 снежня выканала план 1958 года, што калгасы і саўгасы Магілёўшчыны паспяхова нарошчваюць вытворчасць кукурузы. Такім чынам, Мацюшэўскі пазначыў вернасць магілёўскіх камуністаў большасці ключавых накірункаў палітыкі КПСС.

Разам з тым ім былі ўзняты і праблемы: тэхнічнага пераўзбраення магілёўскіх прадпрыемстваў, у тым ліку завода «Строммашына», неабходнасці будаўніцтва завода сілікатных вырабаў, «факты фармалізму, бюракратызму, валакіты ў вырашэнні вытворчых пытанняў, паляпшэнні ўмоў працы і быту рабочых», у прыватнасці на заводзе № 511, дзе ЦК партыі вымушаны быў прымаць «вострае рашэнне» і інш. [2, л. 107–110].

Па-дзелавому канкрэтным было выступленне т. Мацюшэўскага і ў лютым 1960 г. на справаздачна-выбарчым XXIV з'ездзе КПБ. Ён далажыў аб рабоце партыйных камісій і пазаштатных інструктараў, аб поспехах і праблемах вобласці ў развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, аб дзейнасці жансаветаў ва ўсіх калгасах і саўгасах вобласці, аб пытанні адкрыцця ў Магілёве філіяла Мінскага політэхнічнага інстытута, не абышоў і павелічэнне ў 1960 г. пасеваў кукурузы з 45-ці да 84-х тыс. га [3, л. 107–114].

На гэтым з'ездзе ад імя камуністаў вобласці і рабочага класа было даверана выступіць таксама машыністу пячэй Крычаўскага цэментна-шыфернага завода Магілёўцаву І.І., які падтрымаў палітыку партыі і ўрада, распавёў аб станоўчым вопыце работы свайго раёна, але ўзняў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і цэлы шэраг канкрэтных пытанняў да Савета народнай гаспадаркі БССР па забеспячэнню і планаванню работы [3, л. 147–153].

Усяго на партыйным форуме выступіла 26 камуністаў. Абодва магілёўскіх выступоўцы былі абраны ў прэзідыум з'езда, які стаў у гэты раз яшчэ меншым і складаўся з 37 камуністаў. Дзеля прыкладу адзначым і склад новага саставу ЦК КПБ, у які на XXIV з'ездзе было абрана 115 камуністаў, у тым ліку сакратары абкама таварышы Мацюшэўскі і Іваноў, першыя сакратары магілёўскага гарадскога і раённага, бабруйскага камітэтаў партыі Сераброў, Мазур і Цімончык, старшыня абласнога выканаўчага камітэта Лявіцкі. У складзе 51 кандыдата ў члены ЦК быў абраны Купчэня – загадчык Глускага райвыканкама. У рэвізійную камісію – старшыня Шклоўскага райвыканкама Брыкаў, сакратар Бабруйскага гаркома Лукошка, старшыня калгаса імя Жданава Клічаўскага раёна Чарноў [3, л. 6–7, 402–419].

На XXV з'ездзе КПБ 26–28 верасня 1961 г. былі абмеркаваны і адобраны праекты праграмы і статута КПСС, справаздачы ЦК і рэвізійнай камісіі КПБ, праведзены выбары кіруючых органаў кампартыі БССР. Сярод 39 членаў прэзідыума з'езда традыцыйна знаходзіўся першы сакратар Магілёўскага абкама партыі Мацюшэўскі К.В., а таксама зноўку старшыня калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна Арлоўскі К.П. [4, л. 6–8].

У абмеркаванні праекта праграмы КПСС (дакладчык таварыш Сурганаў) прынялі ўдзел 13 чалавек, сярод якіх быў і старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Лявіцкі П.А., які перш-наперш адзначыў, што «новая праграма нашай партыі войдзе ў скарбніцу марксізму-ленінізму як найвялікшая, нягаснучая энцыклапедыя камунізму, як геніяльнае тварэнне нашай партыі і яе Ленінскага цэнтральнага Камітэту». Далей ён распавёў аб поспехах Магілёўскай вобласці, якая выканала план двух год сямігодкі на 108%, аб асваенні ўпершыню ў СССР калектывам Магілёўскага металургічнага завода непарыўнага спосабу адліву труб, аб станоўчым і негатыўным у развіцці сельскай гаспадаркі рэгіёна, у тым ліку аб неабходнасці рамонту або поўнай замены большай паловы жылых дамоў на сяле [4, л. 117–122].

У абмеркаванні праекта статута КПСС (дакладчык таварыш Машэраў) прынялі ўдзел 9 камуністаў. Сакратар Магілёўскага абкама партыі таварыш Іваноў пазнаёміў дэлегатаў з'езда з ходам абмеркавання статута на Магілёўшчыне, падкрэсліў важнасць «не падмяняць савецкія, прафсаюзныя, кааператыўныя і іншыя грамадскія арганізацыі» і ў якасці станоўчага прыкладу работы назваў працу першага сакратара Кіраўскага РК, а як негатыўную ахарактарызаваў працу першага сакратара Шклоўскага РК, які «не валодаў партыйнымі метадамі кіравання» і таму не быў рэкамендаваны на пераабранне [4, л. 142–148].

Мацюшэўскі быў адным з 25 выступаўшых па справаздачах ЦК, якую агучыў таварыш Мазураў, і рэвізійнай камісіі КПБ. Ён распавёў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аб росце «маякоў» – удзельнікаў руху за камуністычную працу ў прамысловасці і на сяле, аб механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці на машынабудаўнічых заводах «Строммашына» і імя Сталіна, на фабрыцы імя Дзяржынскага і аб праблемах наладкі вытворчасці на пабудаванай стужкаткацкай фабрыцы, аб перадавым вопыце механізатара-кукурузавода калгаса «Перамога» Клічаўскага раёна Генадзя Жудро і недахопах у арганізацыі аплаты працы ў калгасах вобласці і інш. пытаннях [4, л. 265–272].

У сакавіку 1966 г. прайшоў чарговы XXVI партыйны форум. Ён быў справаздачна-выбарчым. У прэзідыуме (41 чалавек) знаходзіліся новы першы сакратар Магілёўскага абкама партыі Крыулін Г.А., па традыцыі – Арлоўскі К.П. і брыгадзір комплекснай брыгады саўгаса «Слава» Горацкага раёна Камінская Н.Ф. [5, л. 6–7]. На з'ездзе была заслухана справаздача ЦК, абмеркаваны дырэктывы па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі на 1966–1970 гг., праведзены выбары кіруючых органаў кампартыі рэспублікі

У спрэчках па дакладу першага сакратара ЦК КПБ таварыша Машэрава выступіла 25 членаў партыі. Ад Магілёўскай абласной партарганізацыі слова ўзяў лідэр магілёўскіх камуністаў. Напачатку ён адзначыў, што «усе камуністы, працоўныя нашай вялікай Радзімы, нашы сябры з замежжа жывуць у гэтыя дні думкамі аб надыходзячым форуме камуністаў першай у свеце краіны, якая пракладвае невядомыя шляхі ў светлае камуністычнае заўтра». Прыпыніўся т. Крыулін на поспехах вобласці: росце прамысловай прадукцыі за 7 гадоў у 2,2 раза і сельскай гаспадаркі больш чым у 2 разы, рабоце стала працуючых семінараў па вывучэнню твораў У.І. Леніна і інш. У той жа час першы сакратар Магілёўскага абкама скарыстаўся падзеяй, каб нагадаць аб праблемах будаўніцтва «гігантаў беларускай хіміі» – Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна і Бабруйскага шыннага камбіната, аб тым, што ўсе пазашкольныя дзіцячыя ўстановы знаходзяцца ў прыстасаваных памяшканнях і за 20 гадоў не пабудавана ніводнага палаца піянераў, музычнай ці спартыўнай дзіцячай школы, што пры будаўніцтве мікрараёнаў не прадугледжваюцца спартовыя пляцоўкі. Асобна Крыулін выказаўся аб праблемах футбола. Ён палічыў ненармальным тое, што фінансісты патрабуюць паставіць гэты від спорту цалкам на камерцыйную аснову, з-за чаго прыходзіцца шукаць «лазейкі для парушэння фінансавай дысцыпліны» [5, л. 48–58].

У абмеркаванні дырэктыў па пяцігадоваму плану развіцця краіны (выступіла 11 камуністаў) прыняў удзел сакратар Магілёўскага абкама Іваноў, які сканцэнтраваў сваю ўвагу на перспектывах развіцця гаспадаркі рэгіёна, асабліва адзначыўшы пры гэтым праблемы недахопу будаўнічых магутнасцей [4, л. 330–335].

На XXVII з'ездзе КПБ 26–28 верасня 1971 г. усе пытанні ішлі па ўсталяванаму пры Брэжневе сцэнару: справаздачы ЦК і рэвізійнай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

камісіі, выбары кіруючых органаў кампартыі Беларусі, абмеркаванне дырэктыў па чарговаму пяцігадоваму плану развіцця. У прэзідыуме (43 чалавекі) сядзелі не толькі партыйныя чыноўнікі, у тым ліку першы сакратар Магілёўскага абкама партыі Крыулін Г.А., але і прадстаўнікі рабочага класа і сялянства, якіх ад Магілёўшчыны прадстаўляла Хомчанка В.Л. – памочнік майстра Магілёўскага завода штучнага валакна імя Куйбышава. Дарэчы, Крыуліну даверылі агалосіць спіс членаў мандатнай камісіі, які ён ад імя Магілёўскай, Гродзенскай і Гомельскай партыйных арганізацый прапанаваў з'езду для абрання [6, л. 6–11].

Пасля справаздачнага даклада таварыша Машэрава выступіла 26 з 35 запісаўшыхся для спрэчак камуністаў. Крыулін прамаўляў трэцім. Напачатку ён, натуральна, ад імя камуністаў вобласці падтрымаў курс унутранай і знешняй палітыкі партыі. Потым распавёў аб «перспектыўным планаванні» работы партыйных арганізацый, аб вопыце работы з актывам 1800 пярвічных арганізацый вобласці. Затым пахваліўся ростам аб'ёмаў прамысловай вытворчасці на 65,2% пры плане 51,6%, экспартам прадукцыі магілёўскіх прадпрыемстваў у 67 краін свету, ростам грашовых прыбыткаў насельніцтва вобласці, якія за пяць гадоў выраслі на 64,4% і склалі 640 руб. у год. Ім былі адзначаны дасягненні, у тым ліку завяршэнне элекрыфікацыі і радыёфікацыі вясковых населеных пунктаў, і недапрацоўкі ў развіцці сельскай гаспадаркі, як напрыклад, праблемы абсталявання сучаснымі прыборамі лабараторый Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, невырашэнне якой пагаршае якасць падрыхтоўцы кадраў для вёскі. Калі дасягненні ў выступленні асвятляліся з канкрэтнымі лічбамі, то негатыўныя з'явы – агульнымі фразамі. Трэба адзначыць і тое, што вялікай смеласці для выказвання гэтых прапаноў не патрабавалася. Большасць з іх ужо была агучана ў дакладзе П.М. Машэрава. Дарэчы, асобу лідэра беларускіх камуністаў Крыулін у сваім дакладзе ўзгадаў з шанаваннем тры разы. Гэта не было рэкордам на з'ездзе, але на папярэднім партыйным форуме ён імя галоўнага камуніста БССР не назваў ніводнага разу! Не абышоў першы сакратар Магілёўскага абкама партыі і міжнародныя падзеі. Разважаючы аб ідэалагічнай рабоце, ён адзначыў: «Урокі падзей у Чэхіі і Польшчы пераканаўча сведчаць аб тым, што самая малая недаацэнка ідэйнай загартоўкі камуністаў, усіх працоўных, іх апалітычнасць і пасіўнасць вядуць да страты імі класава пралетарскіх якасцяў, нараджаюць абывацельскія настроі, індывідуалізм і скнарнасць.» Напрыканцы прамоўца ўказаў на неабходнасць аснашчэння партыйных і савецкіх органаў «сучаснай, простай і зручнай у эксплуатацыі аргтэхнікай» [6, л. 37–47].

Адзіным сакратаром райкома партыі рэспублікі, якому давялося выступіць на з'ездзе, трэба разумець – ад імя ўсіх астатніх, стаў першы сакратар Шклоўскага раённага камітэта Дзікун. Ён распавёў аб практыцы партработы ў раёне, аб дасягненнях у вытворчасці малака і мяса, указаў на нізкую рэнтабельнасць ільнаводства, на неабходнасць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яго механізацыі і рэканструкцыі ільнозаводаў, ратаваў за неабходнасць стварэння ў кожным раёне па адной, ці па дзве перадавыя сельскія гаспадаркі [6, л. 100–106].

У ходзе абмеркавання дырэктыў пяцігадовага плана выступілі яшчэ тры камуністы вобласці (14 выступаўшых). Дырэктар саўгаса «Махава» Магілёўскага раёна Яхневіч пераважна распавядаў аб поспехах і перспектывах сваёй гаспадаркі, а ўпраўляючы будаўнічым трэстам № 17 Цімашэнка – аб ходзе работ на «ударнай усесаюзнай камсамольскай будоўлі» Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна. Не абышоў гэтую знамянальную для вобласці падзею – пуск найбуйнейшага ў Еўропе прадпрыемства па выпуску хімічных валокнаў – і старшыня Магілёўскага аблвыканкама таварыш Лукін. У сваім выступленні ён асвяціў гаспадарчыя дасягненні і праблемы, у тым ліку скарачэнне працоўнага насельніцтва на сяле, неабходнасць развіцця дарожнай сеткі рэгіёна і іншыя, а напрыканцы заявіў, што «задачы новай пяцігодкі для нашых людзей цалкам рэальныя» [6, л. 347–352, 383–386, 395–397].

Такім чынам, з'езды праходзілі як добра адрэжысіраваныя мерапрыемствы. Адной з галоўных задач іх была прапаганда курсу партыі. Персаналіі выступаўшых, прысутнасць у прэзідыуме часцей за ўсё вызначалася пасадамі камуністаў, або неабходнасцю адлюстроўваць сацыяльны склад партыйных шэрагаў. Ад вобласці заўсёды выступаў першы сакратар абласнога камітэта партыі і, як правіла, яшчэ адзін ці два камуністы. Нягледзячы на фармалізм і парадднасць партыйных форумаў, у іх матэрыялах можна ўбачыць сапраўднае жыццё нашай краіны, якая тады была часткай вялікай сёння ўжо не існуючай Савецкай дзяржавы. У іх, як у люстэрку, адлюстроўваліся праблемы, якія тады хвалявалі не толькі партыйныя вярхі, але і простых людзей. Менавіта тут можна было, пры наяўнасці асабістай мужнасці і прынцыповасці, узняць пытанні, якія не ўдавалася вырашыць звычайным парадкам. Часцяком, інфармацыя, якая агучвалася на з'ездах партыі, насіла закрыты характар і ў адкрытых крыніцах адсутнічала.

### ЛІТАРАТУРА

1. НАРБ. – ф. 4п, воп. 2, спр. 237.
2. Там жа. – спр. 239.
3. Там жа. – спр. 244.
4. Там жа. – спр. 248.
5. Там жа. – спр. 251.
6. Там жа. – спр. 257.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова